

# БОРТНІК Іван Антонавіч

Бацькі Івана Антонавіча Бортніка ў пошуках лепшай долі з Падбалоцця Зэльвенскага раёна выехалі ў Сібір, у Краснаярскі край. Пабудавалі там свой дом, завялі гаспадарку. У 1923 годзе нарадзіўся ў іх сын Іван.

У 1930 годзе ў сяле Таёжным, што ў Саянскіх гарах, быў створаны калгас "Абуджэнне тайгі", у якім працавалі бацькі Івана.

Пачалася вайна. У 19-гадовым узросце Іван Антонавіч быў прызваны ў армію. Яго часць стаяла на мяжы з Японіяй. Будавалі бліндажы, капалі акопы. Потым радавы Бортнік трапіў на I Украінскі фронт.

- Калі рухаліся на захад, -- успамінаў ветэран, -- у Чалябінску да нашага цягніка падчапілі 4 платформы з кулямётамі. Мне тады даверылі кулямёт, з якім не разлучаўся да апошняга дня вайны. Прабіраліся ўсё далей і далей на захад, да Варонежа.

Нямецкая разведка працавала аператыўна: састаў пачалі бамбіць. З цяжкасцямі цягнік прыбыў на станцыю. Але немцы не супакойваліся, працягвалі скідваць бомбы, у выніку станцыя была ўшчэнт разгромлена. Хто застаўся ў жывых, пайшлі на папаўненне.

Першы бой прымалі ў раённым цэнтры Картаяк Варонежскай вобласці. Адбіўшы немцаў, з баямі накіраваліся на Украіну. У Камянецк-Падольску Іван Антонавіч са сваім сябрам трапілі ў рукі немцаў. Малодшы лейтэнант загінуў, а Івану Антонавічу цудам удалося выратавацца.

Прайшоў з баямі Украіну, потым – Румынію, Венгрыю, Чэхаславакію. Абараняў горад Station Станіслаў. 2-3 мая чэхі ўжо загаварылі аб заканчэнні вайны, а англічане перадалі зводкі аб падпісанні акта аб капітуляцыі. Але радавацца было рана.

- Восьмага мая, -- успамінаў Іван Антонавіч, -- паднялі ўсіх нас па трывозе, пасадзілі ў машыны і рушылі на Прагу. Салдатам была пастаўлен задача выбіць немцаў з горада. Завязаліся цяжкія баі. Страт было вельмі шмат… Было вельмі крыўдна паміраць у апошнія дні вайны. Але мы выстаялі, горад быў вызвалены. 13 мая, у нядзелю, жыхары горада сустракалі сваіх вызваліцеляў з кветкамі.

Пасля вайны І.А.Бортнік вярнуўся ў Зэльвенскі раён, куды пераехалі яго бацькі вясной 1941 года. Жыў у Зэльве, працаваў у раённым аддзеле культуры. Потым вучыўся ў Навагрудскім тэхнікуме, закончыў Жыровіцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі. Займаў пасаду старшыні Крамяніцкага сельскага Савета, 5 гадоў працаваў галоўным аграномам, 3 – галоўным інжынерам і 10 гадоў – старшынёй мясцовага калгаса.

Застаўся жыць у вёсцы Лебядзі. Ажаніўся. Разам з жонкай выгадаваў чацвёра дзяцей.

Памёр. Пахаваны на могілках в.Крамяніца.